**Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народных інструментаў «Быліна» ДУА «Дзіцячая музычная школа мастацтваў №1 г. Гомеля імя П.І.Чайкоўскага»**

Калектыў створаны групай выкладчыкаў народнага аддзялення дзіцячай музычнай школы №1 імя П.І.Чайкоўскага ў 1985 годзе. Першы кіраўнік ансамбля – У.Л.Траянаў.

З 1994 па 2006 год калектывам кіраваў У.Н.Баглай, выпускнік Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва. Найменне «народны»калектыву прысвоена ў 1996 годзе.

Са снежня 2006 года ансамблем «Быліна» кіруе А.В.Склема, выпускнік Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі імя А.В.Луначарскага.

За час свайго існавання калектыў набыў шырокую вядомасць.

У 2002 годзе ансамбль з поспехам гастраляваў па гарадах Францыі і Германіі, ў 2006 − Францыі і Польшчы. У рэпертуары калектыву апрацоўкі твораў вядомых савецкіх, рускіх і беларускіх кампазітараў, музыка кампазітараў-класікаў. «Быліна» з'яўляецца пастаянным удзельнікам канцэртаў для грамадскасці горада: ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і пенсіянераў, дзяцей, работнікаў прадпрыемстваў і ўстаноў. Ансамбль штогод выступае на гарадскіх ўрачыстых мерапрыемствах, а таксама ў гарадах вобласці (Светлагорску, Рагачове, Добрушы, Рэчыцы, Мазыры і іншых). З калектывам супрацоўнічаюць лепшыя вакалісты г. Гомеля: Заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Галіна Паўлянок, Наталля Першукевіч і інш.

«Быліна» ганарыцца не толькі сваімі ўдзельнікамі, а сёння ў калектыве лепшыя музыканты горада: А.Склема, А.Фядзяй, А.Вальніцкая, П.Князь, В.Парашчанка, І.Козарава, В.Самсонава, А.Кузняцова,А.Стрыгун, Г.Собаль, але і сваімі салістамі: Ганнай Собаль, Андрэем Фядзяем. Гэта выдатныя музыканты, якія добра валодаюць сваімі музычнымі інструментамі. Пацвярджэннем таго з'яўляецца атрыманне ў 2013 годзе Андрэем Фядзяем звання лаўрэата XVI міжнароднага фестывалю народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у намінацыі «саліст ансамбля». У 2016 годзе саліст Андрэй Фядзяй быў узнагароджаны дыпломам Гран - Пры на IX рэгіянальным фестывалі гарманістаў «Грай, гармонік» (г. Ельск), а ў 2017 годзе стаў

лаўрэатам II ступені на I міжнародным конкурсе баяністаў «AccoPremium − 2017» (г. Рэчыца).

Ансамбль «Быліна» неаднаразова станавіўся пераможцам розных фестываляў і конкурсаў.

За высокія дасягненні ў галіне мастацтва і значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры ў 2013 годзе ансамблю было прысвоена званне «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь».

23 верасня 2014 года Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль народных інструментаў «Быліна» стаў Лаўрэатам Прэміі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры ў намінацыі «Музычнае мастацтва».

14 снежня 2018 года народны ансамбль народных інструментаў «Быліна» паспяхова пацвердзіў ганаровае званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь».

